**А. М. Палуян, З. У. Шведава**
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай культуры і фалькларыстыкі,
кафедра беларускай мовы

## ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЕ НАВУЧАННЕ ФІЛОЛАГАЎ

Ранейшая сістэма адукацыі была арыентавана на перадачу ведаў. У выніку гэтага маладыя спецыялісты не заўсёды могуць прымяняць атрыманыя веды на практыцы, не здольныя хутка адаптавацца да працоўнай дзейнасці. Гэта сітуацыя з’яўляецца прычынай супярэчнасці паміж сістэмай вышэйшай адукацыі і работадаўцамі, вытворчасцю. На сучасным этапе грамадства мае патрэбу ў самастойных, творчых, ініцыятыўных, прадпрымальных спецыялістах, здольных прапаноўваць і ажыццяўляць ідэі, знаходзіць нетрадыцыйныя рашэнні і рэалізоўваць эканамічна выгадныя праекты. Для падрыхтоўкі такіх спецыялістаў неабходна мяняць тэхналогію навучання і пераходзіць ад тэхналогіі перадачы ведаў да тэхналогіі навучання з набыццём вопыту.

У аснове такой тэхналогіі ляжыць практыка-арыентаванае навучанне, якое павінна садзейнічаць павышэнню матываванасці студэнтаў на атрыманне практычных навыкаў і фарміраванне прафесійнай кампетэнцыі. У адрозненне ад традыцыйнай адукацыі, арыентаванай на засваенне ведаў, практыка-арыентаванае навучанне накіравана на набыццё ведаў, уменняў, навыкаў і вопыту практычнай дзейнасці. Мэтай практыка-арыентаванага навучання з’яўляецца інтэнсіфікацыя працэсу пошуку, атрымання і назапашвання новых ведаў, уменняў і навыкаў для выпрацоўкі пэўных кампетэнцый. Вынікам практыка-арыентаванага падыходу ў навучанні павінен быць выпускнік, здольны эфектыўна прымяняць у вучэбна-пазнавальнай і практычнай дзейнасці кампетэнцыі.

Практыка-арыентаванае навучанне – гэта працэс асваення студэнтамі адукацыйнай праграмы з мэтай фарміравання навыкаў практычнай дзейнасці праз выкананне рэальных практычных задач. У аснове практыка-арыентаванага навучання павінна быць аптымальнае спалучэнне фундаментальнай адукацыі і прыкладной падрыхтоўкі.

Прынцыпамі арганізацыі практыка-арыентаванага навучання з’яўляюцца:

- матывацыйнае забеспячэнне вучэбнага працэсу;
- сувязь навучання з практыкай;
- свядомы і актыўны ўдзел студэнтаў у навучанні.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адукацыйныя стандарты новага пакалення прадугледжваюць умацаванне прыкладнога, практычнага характару вышэйшай адукацыі, адэкватнасць яе сучасным патрабаванням навукі, эканомікі і грамадскага жыцця.

На сённяшні дзень актуальнай застаецца праблемы павышэння практычнай скіраванасці падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне філалогіі, што абумоўлена "неадпаведнасцю паміж патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй з боку работадаўцаў, і кампетэнцыямі, якімі валодаюць выпускнікі ўстаноў вышэйшай адукацыі. Як правіла, маладыя спецыялісты не здольныя хутка адаптавацца да працоўнай дзейнасці, не заўсёды могуць прымяняць атрыманыя веды на практыцы" [1].

З 2013 года тэрміны падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне рускай і беларускай філалогіі скараціліся да 4 гадоў. За гэты час неабходна сфарміраваць комплекс акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый, якія дазволяць спецыялісту рэалізаваць сябе ў сферы сярэдняй і вышэйшай адукацыі, выдавецкай дзейнасці, дзейнасці ў галіне інфармацыйных агенцтваў. Сярод такіх кампетэнцый неабходна вылучыць наступныя:

1) высокі агульны ўзровень развіцця і добрыя базавыя веды;
2) здольнасць сістэмна мысліць, апрацоўваць вялікія аб'ёмы інфармацыі і вылучаць галоўнае;
3) уменне на практыцы выкарыстоўваць атрыманыя веды, працаваць у камандзе;
4) уменне і жаданне пастаянна вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю;
5) здаровы кар'ерызм, мэтаскіраванасць, адэкватнасць ацэнкі сябе як спецыяліста [2, с. 8–9].

"Агульная мэта падрыхтоўкі спецыяліста ў галіне філалогіі – фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай, практыка-арыентаванай кампетэнтнасці, якая дазваляе спалучаць акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя, прафесійныя кампетэнцыі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці; фарміраванне кампетэнцый па кіраванні вучэбна-пазнаваўчай, навукова-даследчай і іншымі відамі дзейнасці навучэнцаў, рэгуляванне адносін і стасункаў у педагагічным працэсе" [2, с. 6].

Усё пералічанае патрабуе актыўнага ўкаранення практыка-арыентаванага падыходу ў вучэбны працэс. Відавочна, што толькі арыентацыя на практычныя дзеянні садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў самастойнасці, самаўдасканалення, здольнасці планаваць і арганізоўваць уласную дзейнасць.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Практыка-арыентаванае навучанне рэалізуецца праз арганізацыю вучэбнай, вытворчай і перадыпломнай  практык студэнтаў з мэтай набыцця імі рэальных прафесійных кампетэнцый па профілю падрыхтоўкі; праз выкарыстанне прафесійна-арыентаваных тэхналогій навучання і методык мадэлявання фрагментаў будучай прафесійнай дзейнасці на аснове выкарыстання магчымасцей прафесійна скіраванага вывучэння профільных і непрофільных дысцыплін; праз дзейсна-кампетэнтнасны падыход, у адпаведнасці з якім практыка-арыентаванае навучанне накіравана на набыццё ведаў, уменняў, навыкаў і вопыту практычнай дзейнасці з мэтай дасягнення прафесійна і сацыяльна значымых кампетэнцый.

Відавочна, што практыка-арыентаванае навучанне немагчыма рэалізаваць выключна ў межах практык. Педагагічны калектыў з першых дзён навучання павінен садзейнічаць паэтапнаму фарміраванню прафесійных кампетэнцый асобы студэнта ў час аўдыторных заняткаў і пры правядзенні выхаваўчай работы. Змест практычных і семінарскіх заняткаў павінен быць накіраваны на індывідуальную пошукавую дзейнасць, у ходзе якой студэнт не проста замацоўвае асноўныя тэарэтычныя палажэнні вучэбнага матэрыялу, а вучыцца прагназаваць, планаваць, у дыялогу раскрываць свае меркаванні і пазіцыю па выбраным спосабе вырашэння вучэбнай задачы, самастойна арганізоўваць сваю дзейнасць. Важным складнікам практыка-арыентаванага навучання з’яўляецца выкарыстанне тэхналогій і метадаў навучання, якія садзейнічаюць эфектыўнаму авалоданню прафесійнымі навыкамі, а таксама фарміраванню прафесійнага мыслення, развіццю творчага патэнцыялу. Праз такую дзейнасць студэнт будзе падрыхтаваны да выканання заданняў на вучэбнай і вытворчай практыках, атрымання і назапашвання вопыту прафесійнай дзейнасці.

Менавіта ў перыяд практыкі выяўляецца ўзровень сфарміравнасці базавых кампетэнцый, калі студэнт праяўляе свае прафесійна-педагагічныя ўменні і навыкі ў практычнай дзейнасці ў комплексе. Тэарэтычнай базай падрыхтоўкі студэнтаў да педагагічнай практыкі з’яўляецца забеспячэнне цэласнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу, развіццё творчага патэнцыялу студэнтаў, павышэнне іх матывацыі да пазнання і набыцця педагагічнага вопыту, да самаўдасканалення.

У перыяд праходжання педагагічнай практыкі асабліва актуалізуюцца наступныя праблемы тэарэтычнай падрыхтоўкі студэнтаў:

1) вузка дысцыплінарны падыход да асваення зместу навучання ў межах прадметнай падрыхтоўкі;

2) недахоп цэласнасці падыходу да фарміравання прафесійна-педагагічных уменняў, якія патрабуюць істотнага абнаўлення псіхолага-педагагічнай і метадычнай падрыхтоўкі;

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

3) недахоп практычных уменняў (камунікатыўных, арганізацыйных, аналітычных), якія неабходна сфарміраваць у межах псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў;

4) недахоп метадычных уменняў, у прыватнасці праектных і прагнастычных, звязаных з фармулёўкай як асабістых мэт і задач, так і пастаноўкай мэт і задач для навучэнцаў.

Для паспяховай рэалізацыі практыка-арыентаванага падыходу неабходна: 1) пераадолець стэрэатыпы мыслення ў выкладчыка па арганізацыі практыка-арыентаванага працэсу навучання, г.зн. пераход ад традыцыйнага працэсу па перадачы ведаў да працэсу з набыццём вопыту; 2) павышэнне прафесійнай кампетэнцыі выкладчыка ў галіне арганізацыі працэсу работы ў сістэме сярэдняй адукацыі, СМІ, выдавецкай дзейнасці; 3) развіццё доўгатэрміновых узаемна карысных сувязей з прадпрыемствамі і арганізацыямі па профілі навучання; 4) развіццё навукова-даследчых работ з удзелам студэнтаў; 5) рас-працоўка тэматыкі скразных творчых праектаў (ад рэферата праз курсавую да дыпломнай); 6) правядзенне мерапрыемстваў па павышэнні матывацыі студэнтаў да навучання па выбранай прафесіі; 7) стварэнне дзейснай сістэмы пошуку і стымулявання таленавітых студэнтаў, прыцягненне іх да выканання навуковых даследаванняў, у тым ліку і на аснове аплаты.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1 Протокол поручений Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко, данных 29 августа 2011г. по итогам совещания с педагогическим активом Республики Беларусь (от 10 октября 2011 г. №20).

2 АСВА1-21 05 01-2013 Адукацыйны стандарт вышэйшай адукацыі. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках). Зацверджаны і ўведзены ў дзеянне Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 88.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ